БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 30 (77)
лістапад
2008 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца
з мая 2006 г.



КАМУНІКАТ.org

с.2

Адбіткі

Свята
с.5

Памяць
с.8

Адбіткі

Рэха выбуху, які прагрымеў у Мінску 3 ліпеня 2008 г. і пра які ўжо пісаў "Брылеўскі летапіс", дакацілася ўрэшце і да нас. Напярэдадні 7 лістапада значная частка брылеўскіх мужчын атрымала павесткі з Магілёўскага РАУС, у якіх было пазначана, што "7.11.2008 г. к 9.00." трэба з'явіцца ў СДК "Брылі". Некаторыя падумалі, што паколькі 7 лістапада -- дзень святочны, то Дом культуры такім хітрым чынам зазывае на святочнае мерапрыемства. І на адпаведныя пытанні прыйшлося адказваць, што ніякага дачынення да павестак культработнікі не маюць.

ПОВЕСТКА №
ПРИ СЕБЕ ИМЕТЬ ДОКУМЕНТ, УДОСТОВЕРЯЮЩИЙ ЛИЧНОСТЬ

Чаканнне...

Паколькі народ у нас дысцыплінаваны, то да 9.00. сабраліся амаль усе запрошаныя. Нават крыху пачакалі, бо міліцыянеры спазніліся на некалькі хвілін. І вось пад'ехалі "Жыгулі", адтуль паказалася 5 чалавек, сярод якіх адразу пазналі нашага ўчастковага В.В.Маскалёва. Работнікі міліцыі прайшлі ў памяшканне, падрыхтавалі месца і ўсе свае прылады, і работа пачалася.

Спачатку вяскоўцаў адмецілі ў вялізным спісе (яго даслалі з Мінску), потым кожнаму намазалі пальцы спецыяльнай фарбай і зрабілі адбіткі на паперы. Працавалі тры спецыяліста, таму работа ішла хутка. Прысутныя ніякіх пытанняў не задавалі: трэба -- значыць трэба. А работнікі міліцыі вельмі ветліва і карэктна рабілі сваю справу. Прапанавалі і мне "адкатаць" пальцы, але калі я адмовіўся, то ніхто і не настойваў, бо справа гэтая дабравольная. У Законе Рэспублікі Беларусь ад 4.11.2003 г. *"О государственной дактилоскопической регистрации"* так і напісана: *"Граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства имеют право на добровольную государственную дактилоскопическую регистрацию"*. Дарэчы, калі хто з "дабравольцаў" перадумае, то згодна артыкулу 15 Закона ёсць адпаведная працэдура знішчэння дактыласкапічнай інфармацыі на падставе заявы канкрэтнага грамадзяніна -- з паведамленнем грамадзяніну аб гэтым у тэрмін не болей за 30 сутак.

Добры настрой У.Шыбакова

Ідзе праца...

...Кожнае злачынства патрабуе свайго раскрыцця. Справа гэта цяжкая і карпатлівая. І галоўнае тут -- каб усё было зроблена па закону і па справядлівасці. І чыстымі рукамі.

Мікола ЯЦКОЎ.

Фотаздымкі аўтара.

Для ветэранаў

5 лістапада 2008 г. ў Брылях аграфірма "Днепр" здзяйсняла продаж капусты па зніжаным кошце для ветэранаў калгаса імя Ільіча. Ветэраны калгаснага будаўніцтва вельмі задаволеныя такімі ўважлівымі адносінамі да сябе.

На здымку: ***Ніна Сідараўна Яўсеева і Мікалай Дзмітрыевіч Смалякоў (на першым плане справа) набылі сабе неабходходную гародніну.***

Універсалы

М.А.Круглякоў

А.У.Саркісян

Калі дзе ў Магілёўскім раёне складваецца форс-мажорная сітуацыя, то Мікалай Аляксандравіч Круглякоў і Андрэй Уладзіміравіч Саркісян, якія працуюць у раённым прадпрыемстве "Райсельгасэнэрга", заўсёды прыходзяць на дапамогу. І хоць яны спецыялісты менавіта ў электратэхніцы, але ж і сантэхнічную справу ведаюць вельмі добра. Што і даказалі, калі ў Брылеўскім СДК на пачатку лістапада здарылася аварыя ў ацяпляльных камунікацыях.

Зрухі

Пасля таго, як 19 верасня 2008 г. кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Аляксандр Іванавіч Разганаў асабіста наведаў рэшткі грамадскай лазні ў в. Брылі, адбыліся пэўныя змены: уваход і вокны ў будынку забілі дошкамі. Пра што гэта сведчыць -- невядома, але ж радуе тое, што нейкія зрухі вакол шматпакутнай лазні ўсё-ткі пачаліся.

ДАМУПІКА.org

Справаздача

Усё гэта зроблена ў Брылях

Мікалай Яцкоў прадстаўляе выставу дырэктару Магілёўскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра Алегу Фёдаравічу Хмялькову.

Начальнік аддзела культуры Магілёўскага райвыканкама Аляксандр Леанідавіч Алекса.

Гучыць песня...

30 кастрычніка 2008 г. у аграгарадку Вейна адбылася справаздача аддзела культуры Магілёўскага райвыканкама. Усё было зроблена ў выглядзе святочнага кірмашу -- з музыкай, спевамі, смачнымі дранікамі і бліна-мі. Было прадстаўлена прыкладное мастацтва. Працавала творчая майстэрня Міколы Яцкова, -- разгарнулася выстава брылеўскай друкаванай прадукцыі (у тым ліку і "Брылеўскі летапіс"), і быў прапанаваны майстар-клас па стварэнню песен. Прагучаўшыя ў выкананні Алы і Міколы Яцковых песні былі вельмі прыязна сустрэты слухачамі.

Аліна САВІЦКАЯ.

Фотаздымкі Вольгі Кузьміной і Алы Яцковай.

"Натхненне" – назаўжды!

30 кастрычніка 2008 г. у Магілёўскім дзяржаўным Універсітэце імя А.Куляшова святкавалі 20-годдзе паэтычнага клуба "Натхненне" факультэта беларускай філалогіі. Сярод запрошаных былі і брылеўцы -- Ала і Мікалай Яцковы. Ала выканала песню "Калыханка" на верш прафесара Універсітэта Васіля Рагаўцова, а Мікалай праспяваў "Восеньскую песню" (словы А. Куляшова) і "Господа юнкера" (словы В.Сухарава).

Аліна САВІЦКАЯ.

Фотаздымак Алы Яцковай.

НАША СВЯТА

16 лістапада 2008 г. у Брылеўскім СДК адбыўся канцэрт, прысвечаны Дню працаўнікоў сельскай гаспадаркі. Вітальнае слова сказала дырэктар Брылеўскай школы-сада, дэпутат Наталля Анатольеўна Ярмаш. Ансамбль "Любава" праспяваў мілагучныя народныя песні "Туман ярам" і "А я ў печы не паліла". Іскрава прагучала "Цячэ вада ў ярок" ў выкананні Любові Шастаковай і Галіны Жукавай. Як салістка, Г.Жукава выканала песню "Рушнікі", а Л.Шастакова песні "Белоснежная вишня" і "Судьба". Крысціна Ляутка вельмі добра адчувае і народную інтанацыю, і эстрадную, таму такія вельмі розныя песні "Травы луговые" і "Три зимы" былі хораша ўспрыняты слухачамі. Сучасную эстрадную харэаграфію прадставілі два танцавальныя калектывы -- Вольга Вараб'ёва і Кацярына Арцёмава, а таксама Юлія Ярмаш, Таццяна Пшанічная, Настасся Саўчына, Аліна Арцёмава і Надзея Паскакухіна. І зноў гучалі песні: Вольга Майбурава расказала што рабіць "На осколках звездопада", Вольга Вараб'ёва прадставіла цэлы блок аўтарскіх песень пад гітару, а Юлія Ярмаш паказала нам уваход на "7 этаж". Упершыню сцэна Дома культуры пачула голас Таццяны Пшанічнай -- разам з Н.Саўчынай яна выканала песню "Плохая девочка". А калі да іх далучылася Ю.Ярмаш, то слухачы пачулі песню "Ангел". Неблагія артыстычныя здольнасці паказалі Артур Жураў, Віталь Пшанічны, Сяргей Бураеў і Юлія Ярмаш у мініяцюры "Из жизни чукчей". У выкананні Мікалая Яцкова прагучалі песні "Осень" і "Браток-сусед", а ў дуэце з Алай Яцковай узляцела песня "Ночь". І адзнакай усім самадзейным артыстам былі апладысменты ўдзячных аднавяскоўцаў.

Л.Шастакова і Г.Жукава

Гледачы

Фотаздымкі Міколы Яцкова

Т.Пшанічная, Ю.Ярмаш і Н.Саўчына

В.Майбурава

К.Арцёмава і В.Вараб'ёва

А.Жураў і В.Пшанічны

В.Вараб'ёва

К.Ляутка

Імгненні

Дзіўная з’ява: усталявалася глыбокая восень, а на полі ля вёскі Зылі, негледзячы ні на што, дружна заквітнелі прыгажуні-рамонкі. *7 лістапада 2008 г.*

На падворку Мікалая Дзмітрыевіча Смалякова стала цеснавата: авечкі прынеслі прыплод. Прычым, у розных матуль атрымаліся аднолькава пафарбаваныя дзеткі -- чорныя з белымі галовамі.

Фота М.Яцкова

Аляксей Трафімавіч Дзенісевіч з в.Зылі ведае што трэба рабіць, каб зімой у хаце было цёпла. *7 лістапада 2008 г.*

Уладзімір Мікалаевіч Раманаў лічыць, што калінекалі можна і памарыць аб такой прыгажосці. А мары, бывае, і здзяйсняюцца... *25.10.2008 г.*

Тусі з вуліцы Кастрычніцкай ў Брылях, ахвотна пазіруюць перад фотаапаратам. *12 кастрычніка 2008 г.*

Брылеўская бібліятэка інфармуе...

ЛИТЕРАТУРНАЯ ГАЗЕТА

№ 43, 2008 г.

22 октября Николаю Константиновичу ДОРИЗО исполнилось 85 лет. Кто не знает слов его знаменитой песни:

Огней так много золотых
На улицах Саратова...
Парней так много холостых.
А я люблю женатого!

Предлагаем вашему вниманию новое стихотворение юбиляра:

Николай ДОРИЗО

К О Л Ы Б Е Л Ь Н А Я

Внучке Кате.

Спутались светлые пряди,
Спишь ты в кроватке своей,
Жизнь моя прожита ради
Тихой улыбки твоей.
Спи, моя внучка красавица,
Спи, ни о чём не скорбя.
Стоило даже состариться,
Чтобы увидеть тебя.

Беды мои и лишения,
Горести прожитых дней,
Всё обрело облегчение
В тихой улыбке твоей.

Думы мои и стремления
В каждый мой радостный миг
Всё обрело продолжение
В блеске глазёнок твоих.
Спи, моя внучка красавица,
Спи, ни о чём не скорбя.
Стоило даже состариться,
Чтобы увидеть тебя.

РЭСПУБЛІКА

1.11.2008 г.

Учёные из Англии установили фактор, от которого зависит, насколько человек доволен своей жизнью. Оказывается, счастье заключается не в количестве денег и материальных благ, а в количестве... друзей. В ходе социологического исследования с участием более 1700 человек учёные выявили тенденцию: у счастливых и довольных жизнью людей много близких товарищей и приятелей, причём они постоянно пополняют список своих знакомых. Среди тех, у кого только 5 друзей и меньше, назвать себя счастливыми могут всего лишь 40%. Наличие от 5 до 10 друзей увеличивают шансы на счастье до 50%. Самый высокий процент довольных жизнью -- среди тех, у кого больше 10 близких приятелей.

МОГИЛЕВСКАЯ ПРАВДА

24.10.2008 г.

СВАТЫ ШЛИ К НЕВЕСТЕ ОГОРОДАМИ

Время с начала октября до середины ноября всегда было порою свадеб.

Начиналось всё со сватовства. В городе им занимались женщины, в деревнях эту роль поручали женатым мужчинам из чмсла родни жениха. Поведение сватов было регламентировано строжайшими правилами. Нельзя было, например, идти в дом невесты 3, 5, 7 и особенно 13 числа, а уж тем более отправляться свататься после захода солнца. К дому будущей невесты принято было отправляться через задний двор, чтобы по дороге ни с кем не останавливаться и не разговаривать. Чтобы не сглазить намечающийся союз, при переговорах дверь горницы непременно закрывали на крючок и не открывали до завершения процедуры. Знающие сваты перед началом переговоров обязательно грели руки у печи. Обычай этот был связан с поверьем, что в печке обретаются души умерших родственников, и прикосновение к ней означало акт уважения и обращение за советом-помощью.

Свахе при первом визите ни в коем случае нельзя было сидеть, есть и пить. Считалось, что коли сваха сядет, дети долго не смогут научиться ходить; поест -- уродятся обжорами; выпьет хотя бы чай -- ударятся в пьянство, когда подрастут.

Был, правда, и другой обычай, который дозволял сватам рассаживаться. В этом случае они должны были устроиться непременно напротив входной двери, а ноги поставить на половицу, ведущую к выходу.

Разговор заводился издалека и предусматривал множество иносказаний: про товар и купца, про куницу и охотника. Исход его мог быть разным, причём наиболее полный сценарий включал не один, а два-три визита сватов, а то и больше.

Сватовство -- лишь первый пункт в предсвадебных обрядах. За ним следовали сговор, осмотр хозяйства жениха, смотрины невесты, рукобитье и запой. И только потом -- свадьба.

МВ Магілёўскія вядомасці

1.11.2008 г.

Замечено, что привлекательный парень с накачанными мышцами и стройным торсом, как правило, не обладает блестящими умственными способностями. В то время как представители интеллектуальных профессий часто имеют лишний вес и бесформенную фигуру. Как выяснили исследователи, характерная для умственно развитых людей деятельность связаны с напряжённой мозговой работой и малой подвижностью тела. Повышенные активность мозга невозможна без дополнительной подпитки в виде глюкозы, которая и способствует полноте.

АРГУМЕНТЫ И ФАКТЫ

№ 45, 2008 г.

Учёные утверждают, что организм человека генетически закодирован на получение полезных веществ из тех продуктов, которые выращиваются и вырабатываются в его климатической зоне. То есть, поедая испанские помидоры, неотличимые с виду от могилёвских, мы по сути наполняем желудок, не принося ни малейшей пользы организму.

Прозвішча падпісчыка

Калі ўважліва прыгледзецца, то амаль ля кожнай вясковай хаты вось такімі шумлівымі выбухамі пазначаюцца дрэвы. Сваімі шырокімі плячыма яны захінаюць жытло ад вятроў і нягод, добра памятаючы ўсё, што тут адбывалася на працягу дзесяцігоддзяў. А яшчэ яны падобныя на дзіўныя антэны, праз якія на неба паведамляецца, што мы былі, ёсць і будзем. І мы ім ўдзячныя за памяць і вернасць, за іх шапатлівыя размовы і мудрую, надзейную стрыманасць. І як жа было б гола і непрытульнана, калі б іх не было побач!..

Мікалай Раманавіч БАРАНАЎ (1929-2008)

6 лістапада 2008 г. на 80-м годзе жыцця памёр Мікалай Раманавіч Баранаў.

Ён нарадзіўся 18 жніўня 1929 года ў в.Брылі ў сям’і Рамана Арцёмавіча і Ганны Піліпаўны Баранавых. З самога дзяцінства вызначаўся стараннай працавітасцю і імкненнем дасканала разабрацца ў розных складанасцях. У час вучобы ў Брылеўскай школе больш увагі звяртаў на дакладныя навукі, і чароўны сусвет лічбаў зрабіўся для яго вызначальным на ўсё жыццё. Пасля заканчэння школы працаваў бухгалтарам у в.Зарудзееўка. Адслужыў у арміі, а потым зноў займаўся бухгалтарскімі справамі ў раённай МТС і на торфазаводзе ў в.Фойна. І больш трыццаці гадоў свайго жыцця аддаў працы ў аўтакамбінаце № 6 г. Магілёва. Даручаныя справы заўсёды выконваў старанна і з вялікай адказнасцю.

Сустрэўшы на сваім жыццёвым шляху Веру Захараўну Дзятлаву, Мікалай Раманавіч аддаў ёй сваё сэрца, і яны разам пабудавалі утульнае сямейнае гняздо, адкуль пайшлі ў свет сыны Святаслаў і Уладзімір і трое ўнукаў -- Раман, Андрэй і Павел.

Жывучы не ў Брылях, Мікалай Раманавіч ніколі не губляў сувязі з роднымі мясцінамі. І, пайшоўшы з жыцця, назаўсёды вярнуўся сюды, каб знайсці вечны спакой пад родным небам.

Бывай, Мікалай Раманавіч!..

АДНАВЯСКОЎЦЫ.

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 299 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© “Брылеўскі летапіс”, 2008

Заснавальнік і рэдактар
Мікола ЯЦКОЎ